**Спецыяльнасць 7-07-0911-04 «Медыка-дыягнастычная справа»**

## ВУЧЭБНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА
## «БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА»

| | |
|---|---|
| **Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны** | Беларуская мова ў сістэме славянскіх моў. Гісторыя беларускай мовы. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Лексіка, сістэмныя сувязі ў медыцынскай лексіцы. Сістэма стыляў беларускай мовы. Медыцынская тэрміналогія беларускай мовы. Паходжанне медыцынскіх тэрмінаў |
| **Сфарміраваныя кампетэнцыі** | УК. Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці |
| **Вынікі навучання** | Студэнт павінен<br>**ведаць:** сістэму сучасных славянскіх моў і месца беларускай мовы ў гэтай сістэме; фанетычныя, граматычныя, лексічныя, арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы; спецыфіку перадачы на пісьме запазычанай тэрміналагічнай лексікі; асаблівасці стылістычнай сістэмы беларускай мовы, у прыватнасці, навуковага стылю;<br>**умець:** перадаваць у сістэму беларускай мовы запазычаную прафесійную лексіку; перакладаць прафесійна арыентаваныя тэксты; рыхтаваць навуковыя і публіцыстычныя выступленні; выкарыстоўваць беларускую мову ў якасці інструмента прафесійнай дзейнасці;<br>**валодаць:** метадамі аналізу тэрміналагічнай лексікі з мэтай выкарыстання нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы; навыкамі афармлення беларускамоўнай дзелавой дакументацыі; лінгвістычнымі навыкамі, неабходнымі для пісьмовай і вуснай камунікацыі на дзяржаўнай мове. |
| **Семестр** | 1 |
| **Прарэквізіты** | Беларуская мова (школьны курс) |
| **Працаёмкасць** | - |
| **Колькасць акадэмічных гадзін** | 54 акадэмічныя гадзіны зсяго, з іх:<br>36 аўдыторных гадзін;<br>18 гадзін самастойнай работы |
| **Формы прамежкавай атэстацыі** | Залік |